ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 219 (1479) | СЕРАДА, 10 верасьня 1931 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менгаркому ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90.
6 месяцаў . . . 1 р. 80.
1 год . . . 3 р. 60.
АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сакратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Камсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ XI.

Кошт асобнага №—2 кап.

ВУЛІЦЫ СЬВЕТУ БЫЛІ ЗАВАЯВАНЫ МЮД'ам

Паліцэйскія атакі, расстрэлы і зьбіеньні не маглі супыніць дэманстрантаў

МЮД дэманстраваў магутнасьць рабочае клясы

КРЫВАВЫЯ ДЭМАНСТРАЦЫІ Ў ВАРШАВЕ

Варшава, 7. Міжнародны юнацкі дзень прайшоў у сталіцы Польшчы надзвычай бурна. Дэфэнзыва загадзя рыхтавалася да выступленьняў рабочай моладзі. За некалькі дзён уся паліцыя была ў баявой гатоўнасьці.

Праводзіліся масавыя аблавы рэвізыі, і арышты. Вуліцы былі абстаўлены паліцэйскімі пастамі і запруджаны шпікамі

Ня гледзячы на ўзмоцнены тэрор, у рабочых кварталах ужо з самага ранку адчуваўся ўзьняты настрой. А дзесятай гадзіне раніцы распачаліся ў розных мясцох Варшавы дэманстрацыі рабочае моладзі. Дэманстрацыі насілі выключна баявы характар. Усюды паліцыя ўжывала пры разгоне дэманстрацый гумовыя палкі, прыклады і агнястрэльную зброю.

На стыку вуліц Смольнай і Вузкай конная паліцыя атакавала дэманстрантаў, пры чым была забіта маладая вучаніца Ядвіга Завісьлякова.

На рагу вуліц Лешна і Жалезнай адбылася таксама магутная дэманстрацыя. Некалькі соцень маладых пролетараў пасьля лятучага мытынгу, разгарнуўшы чырвоны сьцяг, стройнымі радамі накіраваліся да цэнтру гораду. Ім загарадзіў дарогу моцны атрад паліцыі. Паліцэйскую атаку моладзь сустрэла градам каменьняў. Пачаўся сапраўдны бой. Арыштаваных дэманстрантаў моладзь некалькі раз імкнулася адбіць ад паліцыі.

Магутная МЮД'аўская дэманстрацыя адбылася таксама ў Злачове (зах. Украіна). Паліцыя правяла шматлікія арышты. Каля 30 маладых рабочых пасаджана за краты.

Наперакор паліцэйскай забароне

БЕРЛІН, 8. 17 Міжнародны юнацкі дзень прайшоў ва ўсёй Нямеччыне з вялікім уздымам. Асабліва з буйным посьпехам МЮД прайшоў у Рурскай вобласьці. Шматлікія дэманстрацыі, мітынгі рабочай моладзі адбыліся ва многіх гарадох. Масавыя мітынгі адбыліся таксама ў Данцыгу. У Цюрынгіі МЮД сьвяткаваўся ў 15 гарадох і ва многіх вёсках. У правінцыі Браўншвейг адбыўся рад мітынгаў. У Бавары таксама. Ня гледзячы на забарону ўсіх мітынгаў і дэманстрацый, МЮД з посьпехам сьвяткаваўся ў радзе гарадоў.


У мюдаўскія дні на вуліцах Варшавы

„Нам засталася толькі барацьба"

Польшча—гэта „культурны бар'ер цывілізаванага сьвету ад барбарскай краіны бальшавікоў, дзе пануе „жахлівы тэрор", дзе „голад" „беспрацоўе" дзе „ДПУ арыштоўвае ўсіх", дзе „прымусовая праца", дзе „сілай заганяюць у колектывы".

Польшча — увасабленьне буржуазнай цывілізацыі, буржуазнай культуры Паліцэйскія ходзяць у абцяжку, у новых формах, афіцэры — у абцяжку, з цудоўнымі паясамі, з бляшанай бліскучай абшыўкаю казыркі увабраных шапак з пяльчаткамі на руках. Культура! Цывілізацыя!!

Кожны дзень паміраюць працоўныя з голаду, кожны дзень дзесяткі самагубстваў беспрацоўных, кожны дзень дзесяткі і сотні арыштаў.

Гэта—буржуазная культура!

„... Тут „шчасьлівая" польская вёска! Былі жорстка зьбіты усяго толькі! каля дзесятка сялян прымушан прызнаць нават буржуазны пісака.

— Па польскіх афіцыйных вестках колькасьць пачатковых украінскіх школ у Заходняй Украіне скарацілася з 2151 у 1924 годзе да 684 у 1930 годзе"...

Гэта буржуазная культура!

— „Вакол вільгаць, холад і цемра Чуваць піск і шлёпаньне пацукоў, якія зусім не баяцца людзей і часта лазяць па целе, кусаюць за ногі, за рукі, за твар"...

Вось гэта буржуазная культура! Вось гэта буржуазная цывілізацыя!

Вось ужо амаль месяц, як польскі фашысцкі друк паведамляе аб масавых уцё ах сялян з окупаванай Заходняй Беларусі ў СССР.

Фашысцкія забабоны аб жахах і беспрацоўі ў СССР не дапамагаюць. Сяляне ў гэта ўжо ня вераць. Каб спыніць масавыя ўцёкі фашысцкі ўрад прымае драконаўскія меры. Калі хто заікнецца аб тым, што ў СССР перабежчыкі змогуць атрымаць работу, той будзе прыцягвацца да крымінальнай адказнасьці.

Але і гэта не дапамагае. Не дапамагае і тое, што па перабежчыках фашысцкая жандармэрыя адчыняе кулямётны агонь.

Працоўныя яшчэ ведаюць і аб тым, што ўцёкі—гэта ня выхад. Працоўныя ведаюць што толькі ў рашучай барацьбе супроць фашысцкага ўраду, пад кіраўніцтвам КПП і КПЗБ, яны дабʼюцца свабоды.

„Так жыць далей немагчыма! Ня хочам спакойна паміраць у гэтых сырых, халодных сьценах. Ня можам спакойна маўчаць, калі над намі зьдзекуюцца, бьюць, катуюць і не даюць жыць. Нам засталося толькі барацьба не на жыцьцё, а на сьмерць, аж да самага пераможнага канца"...

Працоўныя Польшчы ведаюць, што толькі пад кіраўніцтвам КПП і КПЗБ, у бязьлітаснай барацьбе „не на жыцьцё, а на сьмерць" супроць фашысцкага ўраду, за Савецкую Польшчу, яны здабудуць сабе свабоду, хлеб і працу.

Р.

Паліцэйскімі атакамі ня суняць рэвалюцыйнага ўздыму

ВЕНА. 7.—Як паведамляюць з Будапэшту, там учора на працягу ўсяго дня праходзілі бурныя вулічныя дэманстрацыі, арганізаваныя вэнгерскім камсамолам у сувязі з 17 МЮД.ам.

У дэманстрацыях прынялі ўдзел шырокія масы беспрацоўных. Адбыўся рад жорсткіх сутычак паміж дэманстрантамі і паліцыяй. У некаторых мясцох гэтыя сутычкі прынялі характар вулічных баёў.

Пасьля абеду стварыліся дэманстрацыі беспрацоўных і рэволюцыйнай моладзі за ўсіх раёнах Будапэшту. Дэманстранты накіраваліся у цэнтр гораду, праводзячы па шляху лятучыя мітынгі. Наступаўшыя атрады паліцыі былі сустрэнуты градам каменьняў.

Потым дэманстранты прайшлі у арыстократычныя раёны, уварваліся ў рэстараны і кофэ, якія вядомы, як зборныя пункты фашысцкіх організацый зьбілі наведвальнікаў гэтых рэстаранаў і разьбілі вітрыну.

Конная паліцыя зрабіла некалькі атак на дэманстрантаў, якія супраціўляліся пры дапамозе палак і жалезных пруткоў. Адкінутыя паліцыяй у бакавыя вуліцы, дэманстранты праводзілі лятучыя мітынгі, затрымлівалі трамваі і імкнуліся зрабіць барыкады.

Мобілізавацца на бальшавіцкае зьдзейсьненьне

Апошняя пастанова ЦК УсеКП(б) аб пачатковай і сярэдняй школе уяўляе сабою програму разгорнутай барацьбы за падвышэньне тэмпаў культурнай рэволюцыі, за далейшае пасьпяховае ажыцьцяўленьне ўсеагульнага навучаньня.

Савецкая Беларусь першая з рэспублік Саюзу ўвяла усеагульнае пачатковае навучаньне. Наша краіна пачынае ўжо ажыцьцяўляць усеагульнае навучаньне на базе сямігодкі.

Да 1-га мая 1932 году БССР стане краінай суцэльнай пісьменнасьці. Уся веліч, уся грандыёзнасьць гэтых перамог стане надзвычайна вялізарнай, калі ўспомніць, што ў мінулым наша краіна ўяўляла сабою колёнію Расійскае імпэрыі і была краінай беспрасьветнай цемры.

Ажыцьцяўляючы програму комуністычнай партыі, паводле якой „школа павінна быць не толькі правадніком прынцыпаў комунізму наогул, але і праваднікам ідэёва організацыйнага выхаваўчага ўплыву пролетарыяту на паўпролетарскія і непролетарскія пласты працоўных мас у мэтах выхаваньня пакаленьня, здольнага канчаткова устанавіць комунізм", рабочая кляса атрымала вялікія посьпехі ў справе перабудовы школ.

„Прынцыпова інакшы стаў зьмест усёй работы школы".

Ужо закладзены асновы перабудовы школы на базе політэхнізму.

Аднак, ЦК констатуе, што „савецкая школа далёка яшчэ не адпавядае тым вялізарным запатрабаваньням, якія прад'яўляюцца да яе сучасным этапам соцыялістычнага будаўніцтва". Карэнны недахоп школы—у тым, што навучаньне ў школе не дае яшчэ патрэбнага аб'ёму агульна-адукацыйных ведаў, не дае яшчэ ўпаўне пісьменных людзей, добра ўладаючых асновамі навук (фізыка, хэмія, матэматыка, родная мова, гэографія і інш.)".

У новым навучальным годзе цэнтральная задача нашых школ—гэта барацьба за якасьць у цэлым, за ўзорную пастанову сацыяльных дысцыплін. Наш этап соцыялістычнага будаўніцтва патрабуе ад навучальных установаў—поўнацэнных спэцыялістых,—недавучак у нас не павінна быць. У гэтых адносінах правільнае ажыцьцяўленьне прынцыпаў політэхнізацыі, якая зьяўляецца „складанай часткай комуністычнага выхаваньня", зьяўляецца рашаючай умовай. Няўхільна ажыцьцяўляючы дырэктыву партыі, патрэбна неадкладна рушыць масы працоўных на барацьбу за якасьць політэхнічнага навучаньня. Трэба неадкладна стварыць навучальна-вытворчую базу політэхнічнай школы. Выкарыстаць унутраныя рэсурсы, выкарыстаць кожную майстэрню, кожны вольны варштат для політэхнізацыі—вось чаго патрабуе дырэктыва ЦК

Цэнтральны Камітэт папярэджвае аб тым, што пытаньні політэхнізацыі нельга ставіць абстрактна, што „злучэньне навучаньня з продукцыйнай працай неабходна праводзіць на такой аснове, каб уся грамадзка-продукцыйная праца вучняў была падпарадкавана навучальным і выхаваўчым мэтам школы".

Разгортваньне сеткі майстэрняў і рабочых пакояў пры школах, ажыцьцяўленьне дагавароў з прадпрыемствамі, стварэньне ў кожным раёне і ва ўсіх гарадох сеткі ўзорных школ, організацыя сеткі політэхнічных музэяў і г. д.—усё гэта зьвеньні складанага ланцугу барацьбы за „рэальную сувязь навучаньня з продукцыйнай працай".

Трэба, не паслабляючы барацьбу з правым опортунізмам, як галоўнай небясьпекай, выкрываць і дашчэнту зьнішчаць праявы лявацкай анты-ленінскай тэорыі „адміраньня школы".

Паляпшэньне мэтодычнага кіраўніцтва школай—баявая задача. Яна павінна вырашацца шляхам ліквідацыі адрыву работы навукова-дасьледчых устан ў ад практычнай работы школы. Барацьба за кадры таксама набывае выключнае значэньне ва ўмовах новай абстаноўкі. „Народны настаўнік павінен быць у нас на такой вышыні, на якой ён нікалі не стаяў, не стаіць і ня можа стаяць у буржуазнай грамадзе". Мы павінны і надалей ва ўсёй барацьбе за вырашэньне кадраў няўхільна кіравацца гэтай устаноўкай Леніна. ЦК вызначае шляхі падрыхтоўкі гэтых кадраў, а таксама шляхі палепшаньня матар'яльнага стану настаўніцтва.

Новая абстаноўка, у якой зараз разгортваецца культурная рэволюцыя, патрабуе сапраўды ударнага ажыцьцяўленьня задач, вызначаных апошняй пастановай ЦК УсеКП(б) аб пачатковай і сярэдняй школе. ЦК патрабуе „ад усіх органаў народнае асьветы работы і кіраўніцтва па-новаму, срадпаведна узросшым патрабаваньням якія прад'яўляе к школе соцыялістычная рэконструкцыя народнай гаспадаркі". ЦК зьвярнуў увагу „усіх партыйных організацый на неабходнасьць рашучага ўзмацненьня ўвагі масавай школе, рабоце настаўніка і ўмацаваньню штодзённага конкрэтнага кіраўніцтва школай".

Комсамолу, які зьяўляецца шэфам усеагульнага навучаньня, надзейсць надзвычайна пачэсная роля ў ажыцьцяўленьні задач, пастаўленых рашэньнем ЦК УсеКП(б). Комсамольскія організацыі павінны неадкладна мобілізавацца на справу ўдарнага і баявога ажыцьцяўленьня гэтай пастановы. Гэтая пастанова павінна быць вядома кожнаму рабочаму і колгасьніку, кожнаму настаўніку, культармейцу і вучню. Гэтая пастанова павінна быць неадкладна популярызавана і распрацавана кожнай ячэйкай, кожным заводам, кожным колгасам. Толькі пры гэтай умове—пры ўмове мобілізацыі партыйных, профсаюзных, комсмольскіх організацый, усёй культармі, студэнцтва і вучнёўства — гэта програма будзе па-бальшавіцку зьдзейсьнена.

„Прэч з нападам на СССР. Прэч польскі фашызм і яго агентуру ППС"

(Адозва польскай рабочай і колгаснай моладзі Віцебшчыны да працоўнай моладзі Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны)

ВІЦЕБСК. 7-IX (БЕЛТА). Зьлёт польскай рабочай і колгаснай моладзі Віцебшчыны зьвярнуўся з наступнай адозвай да працоўнай моладзі Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны.

Дарагія таварышы.

Першая конфэрэнцыя польскай работнічай колгаснай моладзі Віцебшчыны ў зьвязку з 17-м МЮД'ам шле вам гарачае пролетарскае прывітаньне. Дзякуючы праведзенай Ленінскай нацыянальнай політыцы польская працоўная моладзь БССР пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі і Ленінскага комсамолу зрабіла вялізарныя дасягненьні на фронце соцыялістычнага будаўніцтва колектывізацыі польскай вёскі, ліквідацыі кулацтва як клясы, а таксама дабілася значных посьпехаў на фронце культурнай рэволюцыі.

Польская працоўная моладзь наразе з працоўнай моладзьдзю другіх нацыянальнасьцяй прымае актыўны ўдзел у барацьбе за пуск у гэтым годзе 518 фабрык і заводаў, а таксама 1040 МТС. У гэтым годзе толькі ў адным Віцебску мы пусьцілі ў рух 5 фабрык на 15 тысяч рабочых, дзе працуе значная колькасьць польскай моладзі. Колектывізацыя Віцебскага раёну праведзена на 70 проц. з 26 польскіх сельсаветаў БССР суцэльна колектывізавана 15.

У нас у БССР польская працоўная моладзь мае шырокі доступ у сярэднія вышэйшых школьныя установы.

На тэрыторыі БССР знаходзіцца 277 польскіх школ. Тры рабочыя факультэты, пэдагагічны тэхнікум, польская сэкцыя пры Беларускім Дзяржаўным Унівэрсытэце, польскую сэкцыю пры Пэдагогічным інстытуце у Гомелі, Палітычна-асьветны тэхнікум, польскі сэктар пры Беларускай Акадэміі Навук, шэраг вячэрніх школ, польскі тэатр і г. д

Сетка пачатковых школ і школ для малапісьменных разам са школамі для няпісьменных будзе штогод узрастаць і да мая 1932 г. зробім БССР краем агульнай пісьменнасьці.

У той час калі Савецкі Саюз ідзе па шляху перамог сусьветнага гістарычнага значэньня, калі з ліквідаваў беспрацоўе пераможна будуе соцыялізм, фашысцкую Польшчу разьядае гніль глыбокага эканамічнага крызісу. Рабочая кляса, працоўная моладзь у Польшчы, Зах Беларусі і Заходняй Украіны аддана на беспрацоўе, жабрацтва і і голад.

БССР мае шырокі росквіт соцыялістычнай культуры па зьмесьце і нацыянальнай па форме усіх нацыянальнасьцяй, у фашыстоўскай Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне пануе нячуваны ўціск нацыянальнага школьніцтва. Культурна-асьветныя ўстановы засталіся ліквідаванымі і разгромленымі, карныя экспэдыцыі, гвалты, крывавыя катаваньні, казэматы, беспрацоўе—вось што дала замест працы, хлеба, зямлі і школ „незалежная" Польшча.

Фашысцкая Польшча бачыць выхад з цяперашняга крызісу ўзброенага нападу па СССР, на адзіную бацькаўшчыну сусьветнага пролетарыяту.

Таварышы, маладыя рабочыя і працоўныя сяляне. Мы сьвяткуем сёньня XVII міжнародны юнацкі дзень У гэты дзень павінны вы выйсьці на вуліцу пад сьцягамі Компартыі і КСМ Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны на барацьбу з фашызмам, на барацьбу з соцыял і нацыянал-фашыстамі гэтымі здраднікамі рабочае клясы. У гэты дзень узмоцнім работу на абарону СССР, на абарону правоў капіталістычных вязьняў.

Толькі пад сьцягам Компартыі пры міжнароднай клясавай салідарнасьці рабочая кляса ў барацьбе за пролетарскую рэволюцыю пераможа.

Прэч з нападам на СССР. Прэч з польскім фашызмам і яго агентамі ППС.

Працоўная моладзь у дзень XVII МЮД'у ў шэрагу КСМ. Няхай жыве комсамол Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. Няхай жыве польская Савецкая соцыялістычная Рэспубліка.

Ёсць, трымаем вахту!

НА БАЯВОЙ ВАХЦЕ

Гэта было ў мінулым.

Сакавік месяц. Растуць дысцыплінарныя праступкі асабістага складу і комсамольцаў, сярод апошніх дасягаюць 20 проц. Лічба трывожная. Прарыў у дысцыпліне.

Трывога! Рухацца далей ня можам! Без жалезнай, рэвалюцыйнай дысцыпліны складанасьці морскага бою ня вытрымаеш, складанай тэхнікі карабля не пераможаш.

Комсамол мобілізоўваўся. Красавік праходзіць у напружаных абставінах. Грамадзкасьць рэзка рэагуе на праступкі.

Май—рэзкі скачок праступкаў уніз. Задача ў асноўным вырашана. Зараз ноль праступкаў ужо не загарамі; пяць-шэсьць ячэек ноль праступкаў ужо мае, але барацьба ня скончана.—„Ноль будзе“.—так сказаў комсамол лінкора.

Прамова Сталіна „За аўладаньне тэхнікай“,—лёзунг Пуфлёта „ўладаць тэхнікай зброі і мэханізмаў“. Комсамол абвяшчае паход за тэхніку. Гурткі, па-за школьныя заняткі па вывучэньню зараджаньня, ля гарматы, башні, машыны, у качагарнях.

Мала здолець тэхніку, трэба яе, вывучаючы, удасканальваць. Барацьба за „збор прапаноў“ па рацыяналізацыі лінкора. Уключаемся ва ўсеармейскі конкурс па збору прапаноў. Партарганізацыя лінкора дае заданьне: кожнаму комсамольцу сабраць не менш 3-х прапаноў па рацыяналізацыі. Першыя ластаўкі; дзесятак-другі прапаноў.—Мала! Зноў мобілізацыя грамадзкасьці. Барацьба за першынства ў маштабе арміі—задача на лёгкая. Ужо сотні прапаноў. Але гэтага мала! Срок конкурсу—15-га чэрвеня. Трэба націснуць,—агульная думка комсамольцаў.

У загадзе Рэўваенсавету Саюзу ССР напісана: „1-е месца па конкурсу належыць лінкору „Парыская Комуна“. Выдаецца прэмія ў 1500 р. на літаратуру“. Але гэта не дае нам повада затрымлівацца, трэба апраўдаць званьне „першага“—асабістым складам адказваем узмацненьнем энэргіі па збору прапаноў.

„Уся масавая работа павінна забясьпечыць выкананьне пяцягадовай баявой падрыхтоўкі“. ПУФЛЁТ абвяшчае агляд работы: караблёў, ваенна-паветраных сіл, берагавай абароны.

Частка комсамольцаў кінута на ўзмацненьне сіл пазашкольнікаў. Арганізуецца жыв. газэта „Залп“ пад кіраўніцтвам комсамольца Навіцкага. Струнны оркестр ператвараецца з 5-6 аматараў у магутны струнны оркестр лінкора. Вынік—першы на МСЧМ Джаз-Банд ці „Джаз-Банда“, як у жарт называюць яго чырвонафлётцы. Конкурсныя вечары па дысціпліне праходзяць з перамогай лінкора. Баявы вечар адкрыта дае канчатковую перамогу. Першынства сярод морскіх сіл Чорнага мора забясьпечана. Па масавай рабоце мы зноў першыя.

2-гі пленум ЦК УсеЛКСМ рашыў: „100 проц. рабочай, батрацкай моладзі—у комсамол і 300.000 лепшых комсамольцаў—у партыю да 17 МЮД“.

Лінкор ня можа быць апошнім на МСЧМ. Праводзім растлумачэньне, цыклевы беспартыйных, мобілізуем друк, наглядную агітацыю. 1—20 жніўня база росту комсамолу вырашана. За ліпень і жнівень у рады партыі перадана 65 комсамольцаў. Зараз — новая задача: барацьба за „узорны карабель на МСЧМ“. Комсамол лінкора ўжо ўключыўся ў гэты конкурс.

К. ВІЛКОЎ

Лінкор „Парыская Комуна“

Можаце быць упэўнены. Мы цьвёрда ахоўваем чырвоныя межы

У гутарцы з нашым корэспондэнтам прадстаўнік лінкора тав. Філарэтаў, які прыехаў у Менск для ўдзелу ў сьвяткаваньні 17 МЮД'у, абмяняўся думкамі аб працы лінкора.

Правядзеньне МЮД'у,—кажа т. Філарэтаў,—супала з сканчэньнем важнейшага этапу баявой падрыхтоўкі. Дагавор з Бальтыцкім флётам лінкор перавыканаў. Увесь плян баявой падрыхтоўкі выканан звыш, чым на 100 проц. Рэўваенсавет ацаніў нашу падрыхтоўку здавальняюча.

Наш лінкор удзел нічаў у абвешчаным газэтай „Красная звезда“ конкурсе, узяўшы першы прыз па ўсёй арміі. Гэтага мы дасягнулі дзякуючы вялічэзнаму ўздыму і высокаму напружаньню сіл усяго складу лінкора, а таксама высокай якасьці баявой падрыхтоўкі.

Соцыялістычным спаборніцтвам і ўдарніцтвам ахоплены 100 проц. складу лінкора. Няма ніводнага чалавека рабочага і батрака, які не ахоплен комсамолам. Наш лінкор у асноўным акомсамолены. На 76 проц. наш лінкор партыйна-комсамольскі. З канца ліпеня да апошняга часу перадана ў партыю 113 чал. Лёзунг Сталіна аб аўладаньні тэхнікай зьяўляецца баявою задачай, над якою мы зараз працуем. Гурткамі тэхнікі ахоплены ўсе чырвонафлётцы.

Акрамя гэтага мы прымаем актыўны ўдзел у соцыялістычным будаўніцтве краіны. Наш лінкор зрабіў 3 выхады на дапамогу саўгасу ва ўборачнай кампаніі. На падліках адзін выхад чырвонафлетцаў даў тое, на што ўсяму саўгасу прышлося-б затраціць 24 дні.

Наш лінкор адным з першых адгукнуўся на пазыку „3-ці рашаючы“ і падпісаўся на 16 з паловай тысяч руб.

Тав. Філарэтаў заявіў, што за апошні час шэфства над лінкорам комсамольскай організацыі Беларусі палепшылася. Аднак, ня сьлед спыняцца на гэтым, а здабытыя посьпехі мацаваць далейшым узмацненьнем шэфства.

У канцы гутаркі тав. Філарэтаў прасіў перадаць ад асабовага складу лінкора шчырае прывітаньне падшэфнаму комсамолу Беларусі і запэўніў ад імя асабовага складу лінкора, што лінкор ускладзеныя на яго задачы выканае з посьпехам.

Па-бальшавіцку, па-ленінску правядзеце баявую вучобу

З ліста комсамольцаў ф-кі імя Крупскай да падшэфных чырвонафлётцаў

Таварышы чырвонафлётцы!

Комсамольскі колектыў Менскай фабрыкі імя Крупскай усімі сіламі змагаецца за выкананьне і перавыкананьне свайго прамфінпляну. Прамфінплян мы выканалі на 100 проц.

У парадку падрыхтоўкі да 17 МЮД'у намі організаваны 15 комсамольскіх брыгад, якія зараз пераведзены на гаспадарчы разрахунак. У дзень 17 МЮД'у мы прэміявалі 18 лепшых комсамольцаў-ударнікаў. Комсамольскі колектыў прымае актыўны ўдзел у рацыяналізацыі і пляніраваньні сваёй фабрыкі. У падарунак МЮД'у мы сабралі 102 рацыяналізатарскія прапановы, якія даюць эканомію каля 25 тысяч рублёў. Комсамолец нашай фабрыкі Герчыкаў унёс рацыяналізатарскую прапанову, якая дае эканомію 10 тысяч руб. З разу ўся наша работа накіравана на ажыцьцяўленьне 6 умоў Сталіна.

Як-жа ідуць справы ў вас—вартаўнікоў чырвоных межаў, вартаўнікоў нашага соцыялістычнага будаўніцтва? Мы добра ведаем аб вашай гэроічнай рабоце па ўзмацненьню баяздольнасьці Чырвонага флёту, аб вашых посьпехах.

Гэтай восеньню, як і ў ранейшыя гады, пэўная частка вашых таварышоў адбывае 4-гадовы тэрмін службы і ідзе ў доўгатэрміновы водпуск.

Наш чырвонаштандарны флёт немысьлімы без кадраў, стойкіх добра ведаючых сваю справу. Нашаму пролетарскаму Чырвонаму флёту патрэбен моцны, палітычна разьвіты баец спэцыялісты.

Рэўваенсавет перад флётам паставіў пэўныя кантрольныя лічбы комплектаваньня кадраў, якія хочуць застацца на звыштэрміновай службе ў флёце. Вы ў гэтым вучастку адсталі. У вас пакуль заваявалася на звыштэрміновай службе зусім нязначная частка. Мы заклікаем вас мобілізавацца, каб выканаць пастаўленыя перад вамі задачы і контрольныя лічбы.

Агульны сход комсамольскага колектыву шпотачнай фабрыкі імя „Крупскай“

9-ты ПАЙШОЎ...

У паходзе за клясава-сьвядомае і пісьменнае папаўненьне РСЧА

Паход уступіў у адказнейшую паласу прызыўнай кампаніі

З рапартамі барацьбы за прамфінплян і колектывізацыю з чырвонымі абозамі павінны ісьці прызыўнікі на прызыўны пункт. Прызыўныя пункты зрабіць сродкам мобілізацыі працоўных мас на ўмацаваньне абароназдольнасьці краіны будуючагася сацыялізму

7-га верасьня ў Беларускай Вайсковай Акрузе распачаўся прызыў трэцяга, рашаючага году пяцігодкі. Такім чынам ус беларускі паход за клясава-сьвядомае і пісьменнае папаўненьне РСЧА ўступіў у надзвычайна-адказны пэрыод. Асабліва цяпер, калі ў радзе месц распачынаецца прызыў, работа па правядзеньню гэтай важнейшай палітычнай кампаніі павінна быць надзвычайна гнуткай, опэратыўнай.

З месц усё яшчэ паступаюць трывожныя сыгналы. Яшчэ ня ўсюды забясьпечана ліквідацыя няпісьменнасьці і малапісьменнасьці прызыўнікоў, яшчэ ня ўсюды забясьпечана выкананьне цэлага раду іншых задач прызыву. Таму паўстае задача на хаду, у часе прызыву, працягваць далейшую работу па забясьпечаньню для Чырвонай арміі поўнацэннага прызыву.

Трэба па прыкладу Менску організаваць работу прызыўнога пункту такім чынам, каб усебакова абслужыць масу прызыўнікоў. Трэба дабіцца таго, каб прызыўнікі ішлі на прызыў з чырвонымі абозамі, ішлі з рапартамі іх барацьбы за прамфінплян, іх гатоўнасьці неадкладна ўключыцца ва ўдарную баявую падрыхтоўку РСЧА.

Трэба памятаць, што ганьба будзе той організацыі, з радоў якой пойдзе ў РСЧА няпісьменны, непадрыхтаваны прызыўнік.

На мэдаглядзе

На менскім прызыўным

7-га верасьня ў Менску пачаўся прызыў. А 9-й гадзіне раніцы організаваным парадкам зьяўляюцца на прызыўны пункт прызыўнікі заводаў „Бальшавік“, „Дрэваапрацоўшчык“. З сьцягамі, лёзунгамі, оркестрамі колёны прызыўнікаў прышлі на прызыў.

Прадстаўнікі заводаў рапартуюць райваенкому аб 100 проц. яўцы прызыўнікоў.

Першы дзень прызыву паказаў, што да гэтай важнейшай палітычнай кампаніі прыцягнута ўвага шырокіх колаў пролетарскай грамадзкасьці. Праведзен вельмі дакладна клясавы адбор. Кандыдатура кожнага прызыўніка абгаворана на шырокіх сходах рабочых і колгасьнікаў.

1-га верасьня адбыўся другі выпуск 4 школ па ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці прызыўнікоў. Выпушчана 40 чалавек.

Прызыў адбываецца ў адным з найлепшых клюбаў Менску—у клюбе харчавікоў імя Сталіна. Памяшканьне клюбу ўпрыгожана лёзунгамі, плякатамі.

У абсталяваньні прызыўнога пункту актыўны ўдзел прынялі Осоавіяхэм, Дом Чырвонай арміі і г. д. Прызыўны пункт абсталяваны добра.

Перш за ўсё прызыўнік зьяўляецца ў яўачны стол, потым праходзіць праверку пісьменнасьці, вушную і вочную камісію, адтуль накіроўваецца у мэдыцынска-адборачную камісію. Упяршыню прызыўнікі праходзяць псыхотэхнічную камісію.

У залі адбываецца консультацыя па пытаньнях прызыву, чытка газэт, літаратуры аб Чырвонай арміі. Організавана выстаўка па гісторыі грамадзянскай вайны і аб мірнай вучобе Чырвонай арміі, організаваны кніжны кіоск, ваенна-хэмічны габінэт.

Для мэдычнага агляду прызыўнікоў у склад прызыўной камісіі вылучаны ўрачы высокай кваліфікацыі. МЦРК організаваў і добра забясьпечыў продуктамі харчаваньня і іншымі рэчамі ларок прызыўнога пункту.

Вялікая ўвага аддазена культурна-мастацкаму абслугоўваньню прызыўнікаў. Культурна-мастацкія сілы Менску высунулі сустрэчны плян і ўзялі на сябе абавязацельства аб штодзённым культурна-мастацкім абслугоўваньні прызыўнікоў.

У першы дзень прызыву а 12-й гадзіне дня да прызыўнога пункту пад'яжджае чырвоны абоз са збожжам колгасаў прыгараднага раёну ў ліку 75 фурманак. Чырвоны абоз упрыгожан лёзунгамі: „Ніводнага кілё хлеба прыватніку“, „ніводнага соцыяльна-чужога ў рады Чырвонай арміі“.

У першы дзень прызыў праходзілі рабочыя заводу „Бальшавік“ і „Дрэваапрацоўшчык“. Учора прайшлі камісію прызыўнікі хлебзаводу, службы цягі і эксплёатацыі, а таксама прызыўнікі з друкарні імя Сталіна.

Настрой прызыўнікоў надзвычайна ўзьняты. Яўка— топроцантная.

Гэтакага прызыву яшчэ не было. Прызыў паказвае вялізарны рост палітычнай актыўнасьці і клясавай сьвядомасьці працоўнага маладняка, які ў гэтым годзе прымае пачэснае зьваньне байца Чырвонай арміі. Прызыўнік.

„Чырвоназьменаўцы“ даносяць

На „Полымя Рэволюцыі“— халадок

Комсамольскі колектыў заводу „Полымя Рэволюцыі“ непадрыхтаваным сустрэў прызыўную кампанію. Ніякая работа па клясаваму адбору прызыўнікоў не праведзена.

Сходаў і гутарак сярод прызыўнікоў таксама не праводзілася.

Партыйны колектыў і комсамолія заводу опортуністычна недаацэньваюць задач прызыву трэцяга рашаючага

У бліжэйшыя дні прызыўнікі 1909 году пойдуць на прызыўны пункт. Гэтыя дні трэба максымальна выкарыстаць для таго, каб прызыў быў поўнацэнным. Опортуністых з „Полымя Рэволюцыі“ гарком павінен прыцягнуць да адказнасьці.

Брыгадзір

ЗРУХ НЕ ЗАМАЦАВАНЫ

Паўторны сыгнал з Крупак

Крупская комсамолія ня гледзячы на шматлікія сыгналы „Чырвонай Зьмены“ сустракае прызыў дрэнна падрыхтаванай. У часе знаходжаньня там брыгады „Чырвонай Зьмены“, „Чырвонаармейскай Праўды“ і „Савецкай Беларусі“ вызначыўся зрух у паходзе за поўнацэнны прызыў. Аднак, гэты зрух райком комсамолу ня здолеў замацаваць і тыя мерапрыемствы і абавязацельствы, якія былі ўзяты комсамольскімі ячэйкамі і прызыўнікамі, не ажыцьцяўляюцца.

Бюро Крупскага РК ЛКСМБ, даўшы цэлы рад практычных дырэктыў комсамольскім ячэйкам, не праверыла іх выкананьня. Абавязацельствы, пляны, мерапрыемствы засталіся на паперы. Організаваны ў часе знаходжаньня ў Крупках брыгады друку штаб па прызыву не разгарнуў работы. Гэты штаб нават ні разу не зьбіраўся. Ніякай работы не вядзецца па забясьпечаньню 40 проц. праслойкі комсамольцаў сярод прызыўнога маладняка.

У некаторых колгасах ужо назіраюцца факты п'янак і прагулаў прызыўнікоў. Культурна-масавая-ж работа не разгорнута.

Крупскі РК ЛКСМБ павінен памятаць, што ганьба будзе організацыі, калі з яе шэрагаў пойдзе ў Чырвоную армію непадрыхтаваны, не загартаваны прызыўнік.

В. Ц.

У бой за 500 і 350.000

БЕЗДАРОЖЖА, ПРЭЧ З ДАРОГІ!

Прывесьці ў праезжы стан 500 кілёмэтраў дарог, насадзіць 350.000 дрэў, організаваць найлепшае выкарыстаньне прасьцейшых машын—забясьпечыць выкананьне ўзятых комсамолам абавязкаў

Комсамолія Беларусі ўключылася ў паход барацьбы з бездарожжам. Зьнішчыць бездарожжа, пабудаваць новую сетку шосэйных і грунтовых дарог, прывесьці ў добры стан дзесяткі тысяч ужо існуючых дарог—гэта значыць зьнішчыць шматмільярдныя страты, павялічыць таваразварот, прасунуць культуры ў глухія куткі Беларусі.

Комсамольская організацыя, улічваючы вялікае значэньне барацьбы з бездарожжам, павінна з пуцёўкаю т. Калініна, зараз-жа пачаць практычна выконваць заданьні для кожнай ячэйкі, кожнага комсамольца, склаўшы пры райкомах штабы кіраўніцтва і вылучыўшы дарожных організатараў у кожнай ячэйцы.

Не чакаючы прыбыцьця складаных і надзвычайна каштоўных дарожных машын, комсамольскія ячэйкі, кіруючыся зьмешчаным сёньня артыкулам інжэнэра т. Зінькова, павінны скарыстаць наяўныя машыны ў кожным колгасе, саўгасе і вёсцы.

ПРАКТЫЧНАЙ ПРАЦАЙ—УКЛЮЧАЙЦЕСЯ Ў ПАХОД

(Об'ект паходу комсамолу Беларусі за ліквідацыю бездарожжа)

Капітальнае будаўніцтва.

1. У галіне капітальнага будаўніцтва кожны райком комсамолу павінен вылучыць на курсы ня менш аднаго комсамольца, каб падрыхтаваць з іх машыністых каткоў і каменадрабілак.

2. Комсамольскім ячэйкам неабходна забясьпечыць свой вучастак будаўніцтва гравійнымі кар'ерамі, каменьнем і пяском, а таксама дамагацца поўнага 100 проц. скарыстаньня працгужпавіннасьці.

3. У прыватнасьці кожны комсамолец, акрамя выкананьня працгужпавіннасьці, павінен прапрацаваць ня менш 10 пагонных мэтраў кар'ера, альбо прапрацаваць і вынесьці ў кар'ера ня менш трох кубічных мэтраў шчэбня.

Па эксплёатацыі.

1. Кожны комсамолец павінен прачысьціць ня менш 30 пагонных мэтраў бакавых, альбо адводных канаў, ці спляніраваць абочыны ня менш, як на працягу 20 пагонных мэтраў дарогі.

У раёнах, дзе праводзіцца капітальны рамонт шосэйнай дарогі, замест гэтай работы кожны комсамолец павінен прагрэбаціць і вынесьці на праезджую частку ня менш 3 куб. мэтраў шчэбня, апрача гэтага, сабраць у штабель на палёх ня менш 10 куб. мэтраў каміня і пасадзіць уздоўж дарогі ня менш 5 штук дрэў.

2. Раённыя камітэты комсамолу павінны праз свае ячэйкі ўстанавіць сталы нагляд за станам працы дарожнага будаўніцтва на вучастку і дзеля дробнага рамонту організаваць рамонтную брыгаду.

3. Комсамольскія ячэйкі павінны забясьпечыць 100 проц. выкананьне прадугледжанай працгужпавіннасьці па рамонту шляхоў.

Па мясцоваму будаўніцтву.

1. Кожны комсамолец павінен зрабіць капітальны рамонт грунтовых дарог на 10 пагонных мэтраў з аканаўліваньнем, палепшаньнем і дабаўкамі неабходных матар'ялаў.

* * *

Паданыя аб'екты—толькі намётка таго, як і дзе павінны ячэйкі ці па собныя комсамольцы ўдзельнічаць у паходзе па ліквідацыі бездарожжа. Гэтыя аб'екты могуць быць зьменены ў паасобных раёнах і вучастках, там, дзе выкананьне іх немагчыма з-за адсутнасьці, альбо з-за скарачэньня гэтых галін працы.

Аднак, кожны комсамолец павінен выканаць аб'екты па аднаму з відоў будаўніцтва ў тых раёнах, дзе сустракаюцца ўсе тры віды будаўніцтва, альбо два. У гэтым напрамку раённым камітэтам патрэбна, па ўзгадненьню з прарабамі і начальнікамі дыстанцый ці райдар'інспэктарамі, раставіць свае сілы так, каб на кожным будаўнічым вучастку ўдзельнічалі ў працы комсамольцы, улічыўшы важнасьць і чарговасьць таго ці іншага будаўніцтва.

У цэнтральным штабе

8-га верасьня адбылося вузкае чарговае пасяджаньне ўсебеларускага штабу па барацьбе з бездарожжам. Штаб абмеркаваў плян практычнага ўдзелу Галоўдартрансу і Колгасцэнтру па гэтаму пытаньню. Гэты плян у бліжэйшыя дні рассылаецца райвыканкомам і райколгассаюзам для непасрэднага кіраўніцтва і выкананьня.

Аднак, некаторыя організацыі і ўстановы, як Будрабʻяднаньне, Наркомзем і Аўтадор ня выпрацавалі пляну конкрэтнага дзеяньня сваіх установаў у барацьбе з бездарожжам, што значна тармозіць складаньне агульнага пляну ўсебеларускага штабу.

Акрамя гэтага, непасрэдныя ўстановы па дарожнаму будаўніцтву і зацікаўленыя ў гэтым організацыі і ўстановы безадкладна адносяцца да стварэньня прэміяльна-грашовага фонду пры ўсебеларускім цэнтральным штабе. Да гэтага часу ня вызначаны грошы ў прэміяльны фонд і на організацыйныя патрэбы ўсебеларускага штабу, так неабходныя для разгортваньня опэрацыйнага кіраўніцтва райкомамі і комсамольскімі ячэйкамі.

Неабходна зараз-жа дабіцца пералому ў гэтай рабоце.

Адрамантавалі дарогі

Рудзенск 8. (наш кор.) Дзякуючы таму, што Рудзенскі сельсавет правёў сярод працоўнага насельніцтва організацыйна масавую работу, усе працаздольныя як адзін выехалі на суботнік па дарожнаму будаўніцтву. Дарогі на тэрыторыі Рудзенскага сельсавету адрамантаваны.

Кулацкая спроба сарваць дарожнае будаўніцтва атрымала рашучы адпор.

Аднак, некаторыя комсамольцы з Рудзенскай ячэйкі, мобілізаваныя райкомам на дарожнае будаўніцтва, ганебна дэзэртавалі з гаспадарчага фронту. Вось гэтыя дэзэртыры: Сянчук Павал, Хмялеўскі Пятрок, Піскун Міхась і інш.

Комсамольскай ячэйцы неабходна прыняць тэрміновыя захады да дэзэртыраў.

ыгор М.

Невыстарчальныя тэмпы

Правільная організацыя і поўнае скарыстаньне гужпавіннасьці—неабходная ўмова для выкананьня прамфінпляну дарожнага будаўніцтва. На гэты рашаючы момант Галоўдартранс, райвыканкомы і сельсаветы на масцох не зьвяртаюць належнай увагі. Райвыканкомы і сельсаветы яшчэ ня вызначылі з складу прэзыдыуму адказных за дарожнае будаўніцтва, колгасы не далі сваіх упаўнаважаных.

Галоўдартранс не забясьпечыў раёны адміністрацыйным і тэхнічным пэрсоналам, ня даў гнуткага опэрацыйнага кіраўніцтва дарожнаму будаўніцтву мясцовага значэньня. Надзвычайна кепска пастаўлен вучот працы раёнаў.

На дарожным будаўніцтве пануе абязьлічка. Колгасам, вёскам ня вызначаны вучасткі будаўніцтва рамонту дарог за становішча якіх павінны несьці адказнасьць


Таму не выпадковым зьяўляецца нізкі процант выкарыстаньня працоўнай гуж-павіннасьці, які дасягае толькі 32 проц., што значна адбілася на выкананьні програмы 1931 году.

Не забясьпечана выкананьне вызначанай програмы дарожнага будаўніцтва мясцовага значэньня пабудаваць 26 кілёмэтраў мошчаных дарог; 87 клм. гравійных, 140 клм. грунтова-устроеных, прывесьці ў праежджы стан 5032 клм і пабудаваць мастоў 14450 пагонных мэтраў.

На 1-е ліпеня гадавое заданьне па 58 раёнах выканана: па мошчаным дарогам на 40 проц па грунтова-устроеных на 27 проц., па прывядзеньні дарог у праежджы стан на 27 проц. і па будаўніцтву і рамонту мастоў на 62 проц.

Ганебна адстаюць па выкананьню програмы будаўніцтва дарог мясцовага значэньня: Расонскі, Сіроцінскі, Лепельскі, Бешанковіцкі, Касьцюковіцкі, Кармянскі, Старобінскі, Рэчыцкі, Церахоўскі і Лоеўскі раёны. Гэтыя раёны не даюць зьвестак аб ходзе дарожнага будаўніцтва Галоўдартрансу.

М. П.



ГЭТЫЯ МАШЫНЫ МАЕ КОЖНЫ КОЛГАС—

выкарыстайце іх для будоўлі дарог

Для пабудовы і трыманьня ў спраўнасьці грунтовых дарог патрэбны прасьцейшыя машыны, часткі іх маюцца у любой сельскай гаспадарцы, а нехапаючыя могуць быць зроблены на месцы работ саматужным спосабам без асобых затрат.

Для гэтых работ неабходна мець: машыны для рыцьця і ачысткі кюветаў (бакавых канаў), сюды адносяцца звычайныя с. г. плугі і канавакапальнікі, машыны для ушчыльненьня і выпраставаньня палатна дарогі; сюды адносяцца с.-г. бароны, плянэры і прасы („утюги") машыны для ачысткі дарогі ад сьнегу; сюды адносяцца сьнегаачышчальнікі.

Звычайны плуг ўжываецца дзеля таго, каб разворваць (рабіць пухкім, мяккім) грунт, каб палегчыць работу канавакапальніка (плугам раскапваецца верхні слой на глыбіні 10-12 сантымэтраў).

Плуг працуе наперадзе канавакапальніка.

Канавакапальнік (канаваачышчальнік) -- прасьцейшы тып для канаў (кюветаў) трыкутнага сячэньня--складаецца з дзьвёх дошак, злучаных у цьвёрдую конструкцыю пад кутом у 30 градусаў. Ён можа служыць для пракопкі новых кюветаў і для ачысткі існуючых ад заплываў і насосаў.

Бароны ўжываюцца пераважна дыскавыя, але таксама з посьпехам могуць ужывацца і зубчатыя. Пласты паднятай зямлі, перасунутыя на палатно дарогі, каб надаць ёй пукаты профіль, крышацца баронамі, і тым самым аблягчаецца работа прэсу.

Параконная дыскавая барана мае цотны лік (8-12) дыскаў. Дыямэтр дыску—40 сантымэтраў. Пры звычайнай баране з жалезнымі зубамі, яе па адным месцы працягваюць 2-3 разы.

Прасы служаць дзеля таго, каб перамяшчаць грунт, разроўніваць яго зрэзваць няроўнасьці, выпрасоўваць і ўшчыльняць дарожнае палатно. Прасы бываюць мэталічныя і драўляныя.

Драўляны прас уяўляе сабою дзьве дошкі ці пласьціны, пастаўлены на кант простастаўна паміж сабою злучаныя распоркамі і балтамі. Прасы ўжываюцца як для пабудовы новых аўтагужавых дарог, так і для рамонту старых.

Пярэдняя сьценка прасу зьяўляецца рабочай сьценкаю, да яе на двух балтах прымацоўваецца ланцуг, які служыць дзеля цягі. Рэжучая частка рабочай сьценкі, якая нясе ўсю нагрузку акоўваецца паласавым жалезам пры чым жалезная паласа прымацоўваецца да дошкі так што яна выпускаецца ўніз, прыкладна на 5 мм. ніжэй краю дошкі ў пярэднім канцы, а на заднім „заподлыцо". Такое мацаваньне акоўкі рабочае сьценкі робіцца з тэю мэтай, каб, загрузіўшы прэс, прымусіць яго ўрэзацца ў грунт і тым самым перасоўваць вялікія масы грунту, Задняя сьценка прасу прызначана для запрасоўваньня і ўшчыльненьня палатна дарогі, і таму лепш яе ставіць нахілена, наставіўшы яе гарбылём у бок руханьня прэсу.

Плянэр. Хуткасьць руху па дарозе залежыць ад стану яе паверхні. Па няроўнай дарозе хуткасьць руху вельмі нязначная.

Несвоечасовае зьнішчэньне выбоін цягне за сабою разбуранасьць палатна дарогі. Каб пазьбегчы гэтага, дарогу патрэбна пэрыодычна рамантаваць. Для рамонту грунтавых дарог ужываюцца тыя-ж прылады, што і для яе пабудовы (канавакапальні, прасы і плянэры). Плянэр—гэта ўдасканалены прэс і дае больш гладкую паверхню дарожнага палатна.

Драўляны пленэр, прасьцейшага тыпу, напамінае сабою санкі складаецца ў асноўным з рамы разьмерам 3600×1500 мм., зьвязанай у папярэчным напрамку касымі рэбрамі, скаванымі жалезам.

Адзін з палазоў пленэра пабудаваны на асобных каратышох, ствараючы вокны, праз якія можа праходзіць зрэзаны грунт.

Уся рама дзеля большае моцы ахоплена дадаткова дошкаю па дыяганалі. Для цягі пленэра, а за пярэдні брусок мацуецца на двух балтах ланцуг, даўжынёю каля 1 з з па‹. мэтра. Вага такога плянэра каля 200 кг.

Сьнегачышчальнік ужываецца для ачысткі дарог ад сьнегу, глыбіня якога не перавышае 400 мм. Асноўныя памеры сьнегаачышчальніка: даўжыня $4^1/_4$ мэтра, шырыня задняй часткі крыху менш 3 мэтраў і вышыня—55 мм.

Вага такога сьнегаачышчальніка—прыкладна 700 кг.

* * *

Мэючы такі нескладаны асортымэнт машын, з невялікімі грашовымі затратамі можна з посьпехам будаваць і рамантаваць прасьцейшыя грунтовыя дарогі.

Інж. Зінькоў („К. П.").

6 умоў—вытворчы плян цэху

Завод імя Варашылава

Рабочы колектыў заводу імя Варашылава дабіўся таго, што прамова тав. **Сталіна** стала настольнаю кнігай, вытворчым плянам кожнага рабочага, кожнага цэху. Завод дабіўся значных перамог у рабоце.

Ураўнілаўка ліквідавана.

Створаны вядучыя групы таварoў, якія ў сваю чаргу згрупаваны па разрадах. З кожнай групай праводзяцца заняткі па больш дасканаламу вывучэньню тэхнікі справы. Там-жа праглядваюцца і прапрацоўваюцца старыя і новыя тарыфныя сеткі. Такім чынам узьнімаецца зацікаўленасьць слаба кваліфікаваных рабочых.

Абязьлічка на заводзе ў асноўным ліквідавана. Зьнішчана ранейшая безадказнасьць у выкананьні заданьняў.

Усе рабочыя разьбіты на групы, якія маюць свой асобны выхадны дзень і прымацаваны да пэўных варштатаў. Адносіны да мэханізмаў і варштатаў сталі цяпер асабліва ашчаднымі.

Зараз чакаць самацёку рабочай сілы, значыць не разумець новых умоў, значыць заусёды знаходзіцца пад пагрозай недахопу рабочай сілы.

Гэта добра ўсьвядомлена „варашылаўцам".

Вядуцца перагаворы з колгасамі Сьмілаўскага і Самахвалаўскага раёнаў аб прысылцы рабочай сілы на завод. Цякучасьці рабочай сілы за апошнія часы не наглядаецца.

З мэтай выхаваць рабочую тэхнічную інтэлігенцыю, на заводзе працуюць гурткі малодшага і сярэдняга тэхнічнага пэрсоналу, туды-ж уваходзяць і рабочыя вышэйшых разрадаў.

Усе гэтыя зьмены перайшлі на гаспадарчы разрахунак.

Цяпер праводзіцца падрыхтоўчая работа па пераходу на гаспадарчы разрахунак кожнага рабочага, кожнага варштата.

Гэта надзвычайна важнае мерапрыемства. Трэба спадзявацца, што „варашылаўцам" яно ўдасца і што нашы заводы і фабрыкі пачхопяць і скарыстаюць іх вопыт.

Значна горш справа з падрыхтоўкаю кваліфікаваных кадраў. Брыгаднаму вучнёўству аддаецца нязначная ўвага.

І гэта ня толькі на адным заводзе імя Варашылава. Падрыхтоўка кваліфікаванае рабочае сілы кульгае і па радзе іншых прадпрыемстваў. Такое зьявішча бязумоўна ня можа быць цярпіма, бо падрыхтоўка кваліфікаванай рабочай сілы самім прадпрыемствам—адна з умоў, пастаўленых перад заводамі і фабрыкамі тав. **Сталіным**

Програма баявой дзейнасьці выконваецца марудна

Завод Д. А.

Прайшло два месяцы з часу надрукаваньня гістарычнай прамовы т. Сталіна—гэтай баявой програмы дзеяньня кожнага заводу і фабрыкі. Аднак выкананьне яе на заводзе „Дрэваапрацоўшчык" праходзіць вельмі марудна.

У забесьпячэньні рабочаю сілай на заводзе пануе самацёк. Дагавораў з колгасамі заводакіраўніцтва і ня думала складаць. А ў гэты час будуецца і хутка будзе скончаны новы цэх, для якога патрэбны будуць сотні рабочых.

Наглядаюцца праявы ўраўнілаўкі а адгэтуль цякучасьць рабочае сілы. У выніку прамфінплян за жнівень выкананы толькі на 89 проц.

БЕЛТА

Ударныя брыгады комсамольцаў—на церабленьне і пераапрацоўку лёну

Церабленьне і першапачатковая пераапрацоўка лёну праходзіць слаба. На 1-е верасьня плян церабленьня лёну выкананы на 46 проц, Абмалочана 18,4,% гэткая-ж колькасьць замочана і разаслана.

Матар'ялы з Слуцкага і Чырвона-Слабодзкага раёнаў сьведчаць аб тым, што комсамольскія організацыі гэтых раёнаў дрэнна змагаюцца за сваячасовае выкананьне пляну церабленьня і першапачатковай пераапрацоўкі

Трэба тэрмінова кінуць сілы комсамольскіх організацый на ўборку лёну. Правільна організаваць працу і расставіць сілы.

Комсамольскія ўдарныя брыгады—на церабленьня лёну і яго першапачатковую пераапрацоўку!

Мацней удар па опортуністычнай практыцы!

Скончылі ўборку і расьцілі лёну

Колгас „Інтэрнацыянал", Горбаўскага сельсавету, Лёзьненскага раёну, на 4-е верасьня па-большасьці скончыў абмалот і расьцілі лёну. Разаслана 133 га. „Інтэрнацыянал" па-баявому праводзіць асеньнюю сяўбу. На 4-е верасьня засеяна 170 га азімых культур, сяўба працягваецца.

Таксама колгас ужо прыступіў да ворыва пад зяб, ужо ўзарана 60 га. Уборка яравых праходзіць пасьпяхова: на 4-е верасьня ўбрана 223 га і абмалочана 15 га.

Колгас пасьпяхова праводзіць сілосаваньне кармоў; ужо засілосавана адна траншэя ўмяшчальнасьцю 100 тон масы, пачата закладка кармоў у другую траншэю.

Посьпехаў на фронце ўборкі яравых, сілосаваньня і асеньняй сяўбы колгас „Інтэрнацыянал" дасягнуў, дзякуючы ўкараненьню ва ўсе галіны сельска-гаспадарчае працы соцыялістычных мэтадаў, увядзеньню соцспаборніцтва паміж паасобнымі брыгадамі і групамі, перавядзеньню ўсёй працы колгасу на зьдзельшчыну.

Растлумачальная праца і прапрацоўка пастановы НКЗ і колгасцэнтру аб разьмеркаваньні прыбыткаў у колгасах на 1931 год выклікала новы працоўны ўздым у масах колгасьнікаў.

Не малую ролю ў організацыі колгаснай працы адыграла колгасная комсамольская ячэйка, якая ўсе гаспадарчыя пытаньні, як абмалот лёну, асеньні сеў, зяблівае ворыва і г. д., деталёва абгаворвала на сваіх сходах і прымала цэлы рад конкрэтных мерапрыемстваў, за якія ўпарта змагаецца і праводзіць у жыцьцё

М. Гузоўскі.

Чырвона-Слабодзкі райколгассаюз ня выконвае дырэктыў партыі

Па Чырвона-Слабодзкім раёне лёну прыбрана ўсяго толькі 50 проц. Папярэдняй падрыхтоўкі да ўборкі райза і райколгассаюз не праводзілі.

Райколгассаюз бязьдзейнічае, спасылаючыся на тое, што адказнасьць за ўборку тэхкультур ускладзена на МТС. Пляну ўборачнай і зьвестак аб тым, як праходзіць уборка па колгасах ня мае. Такім чынам Чырвона-Слабодзкі райколгассаюз зьняў з сябе кіраўніцтва кампаніяй уборкі тэхкультур і як бы самаліквідаваўся Старшыня райколгассаюзу кажа:—„што-ж, мы нічога ня ведаем, бо ўсю працу па ўборцы тэхнічных культур узяла на сябе МТС".

Нажаль, ні райком партыі, ні РВК не пацікавіліся праверыць як кіраўніцтва райколгассаюзу змагаецца за сваечасовае сканчэньне ўборкі тэхнічных, як выконвае дырэктывы партыі аб перабудове работы і вырашэньні проблем тэхнічных культур.

Дырэктывы партыі аб організацыйна-гаспадарчым умацаваньні колгасаў райколгассаюз не праводзіць у жыцьцё. Улік і організацыя працы ў колгасах пастаўлены дрэнна. У радзе колгасаў запіс працадзён праводзіцца раз у месяц. Бывае, што ў колгасьнікаў не хапае па 10-12 працадзён (у колгасе „Майскі луч"), а ў колгасе „МОПР", каб паскорыць правядзеньне ўборачнай кампаніі, нават дайшлі да таго, што праводзяць уборку з трэцяй капы, г. зн. для колгасу выцярабліваюць два сьнапы, а для сябе адзін. І вышла так, што людзі, якія церабілі лён, для колгасу вязалі маленькія сьнапы, а сабе вялікія.

Здзельшчына ўведзена формальна. Нормы выпрацоўкі вызначаюцца, як хто захоча. На церабленьне гэктара лёну к-с „МОПР" ставіць 17-18 жанчын, а ў суседніх колгасах спраўляюцца з гэтым 8 жанчын.

Яшчэ больш абураючы факт. Колгасы „Перамога" і „Майскі луч" неапрацаваны з мінулага году лён скарыстоўваюць для падсьцілкі. Райколгассаюз і інш. раённыя організацыі пра гэта ведаюць, але маўчаць.

Пералічаныя факты зусім яскрава сьведчаць аб тым, што кіраўніцтва Чырвона-Слабодзкага райколгассаюзу не справілася са сваімі задачамі. Яно па-опортуністычнаму аднеслася да правядзеньня ўборачнай кампаніі і дырэктыў партыі аб організацыйна-гаспадарчым умацаваньні колгасаў. Райком партыі і РВК павінны тэрмінова зацікавіцца работай райколгассаюзу і прыняць адпаведныя меры да тых, хто ня выконвае дырэктыў партыі.

Алесь Сачко.

Завод пусьцім к тэрміну

Вушацкі раён па спэцыялізацыі аднесьлі да раёнаў з ухілам ільнаводна-жывёлагадоўчым. У вясеньнюю пасеўкампанію пасеўплошча лёну даведзена да 4243 га, альбо 102 проц. пляну НКЗБ.

Уборка лёну па раёне скончана поўнасьцю. Разгортваецца першапачатковая яго пераапрацоўка.

Будуецца ільна-апрацоўчы завод. Да 1-га кастрычніка ён павінен быць скончаны, каб пераапрацаваць усю тэхсыравіну колгасаў.

На 1-е верасьня плян будаўніцтва ільна-заводу выкананы толькі на 48 проц. Асноўная прычына ў тым, што ў будаўніцтве мелі месца факты шкодніцтва, грамадзкае ўвагі і дапамогі ня было.

Райком партыі і комсамолу улічваючы нездавальняючы стан будаўніцтва, што пагражае затрыманьнем пуску заводу прынялі рад мерапрыемстваў. Сярод рабочых пабудовы прапрацавана прамова Сталіна. Рабочыя ўзялі рад абавязацельстваў па ліквідацыі прарываў на будаўніцтве (шырока разгарнулі соцспаборніцтва і ўдарніцтва, замацаваліся да канца пабудовы і г. д.) Райком комсамолу таксама ўзяў на сябе рад абавязацельстваў. Вылучан член бюро РК адказным за будаўніцтва ільна-заводу, організавана комсамольская брыгада, якая накіравана на дапамогу будаўніцтву. Юнкораўскі пост на заводзе ўзяў пад свой штодзённы кантроль ход будаўніцтва і накіраваны комсамольцы для разгортваньня культурна-масавай работы сярод рабочых.

Тэмпы будаўніцтва зараз хутка ўзьняліся ў гару. Калі ня будзе затрымак з забясьпечаньнем будаўніцтва дэфіцытнымі матар'яламі, завод пачне працаваць у вызначаны тэрмін.

Ліпаўка

Плян уборкі тэхнічных выканалі на 100 проц.

Пухавічы. 9—(па тэлефону). Колгасны сэктар Пухавіцкага раёну поўнасьцю закончыў уборку тэхнічных культур, выканаўшы плян на 100 проц. і выклікаў аднаасобны сэктар пасьледваць яго прыкладу.

Рыг. Малаток

Да тэрміну прыбраць махорку!

Уборка па Слуцкім р-не тэхнічных культур, у тым ліку махоркі, знаходзіцца ў катастрофічным стане. З патрэбных 50 га махоркі, прыбрана толькі 5 га, альбо 10 проц. Ні райвыканком, ні райколгассаюз ня ўжылі энэргічных мер. Райколгассаюз нават ня даў указаньняў колгасам аб тэрмінах уборкі.

Бязьдзейнічае і райком комсамолу. Комсамольская організацыя не мобілізавана на фронт уборкі тэхкультур і махоркі. Буйнейшыя комсамольскія ячэйкі „Івань", „Будаўнікоў" і „1-е Мая" палец аб палец ня вырялі, каб паскорыць уборку махоркі і іншых тэхнічных культур.

Райколгассаюз і Райза не перабудавалі сваёй работы і кіраўніцтва колгасамі па опэрацыйнаму. Кіраўніцтва колгасамі ўсё яшчэ ажыцьцяўляецца на паперы.

Уборка і першапачатковая пераапрацоўка тэхнічных культур патрабуе конкрэтнай дапамогі спэцыялістых. Аднак, агрономічныя сілы раёну ў большасьці сядзяць у габінэтах, замест конкрэтнай дапамогі займаюцца пісаніяй. Райколгассаюз і Райза ня думаюць над тым, як больш рацыянальна выкарыстоўваць агра-тэхнічныя сілы, каб вызваліць іх ад тэхнічнай працы ў габінэтах і накіраваць у колгасы.

Райком партыі і РВК павінны зацікавіцца работай Райза і райколгассаюзу ў адпаведнасьці з новымі задачамі і прыняць меры, як'я-б забясьпечылі перабудову работы Райколгассаюзу.

Комсамольская організацыя павінна кінуць усю сваю сілу і напорыстасьць на ўборку тэхнічных і махоркі. 175 тон таварнай продукцыі махоркі павінна быць прыбрана ў тэрмін.

Юнкор „Ч. З" Я. Жылка.

Брыгадная сыстэма вырашае тэмпы

У колгасе імя Войкава Зубоўскага сельсавету (Копыскі р-н) за 10 дзён ударнай работы выбрана лёну 30 га, палова лёну абмалочана і разаслана.

Уся работа ў колгасе праводзіцца на аснове ўдарніцтва і соцспаборніцтва. Колгасьнікі разьбіты па брыгадах, уведзена зьдзельшчына, якая ўлічваецца на колькасьці і якасьці работы.

М.

Толькі 15 проц

Асьвея. З 2850 тон, якія павінны быць засілосаваны па плану на 25 жніўня засілосавана толькі 186 тон. Сілосным культурам пагражае небясьпека застацца няўбранымі. Да гэтага часу ўбрана толькі 15 проц. засеянай плошчы.

Прычына ў тым, што партыйныя, комсамольскія і грамадзкія організацыі не мобілізавалі масы вакол гэтага пытаньня.

Не пакінуць ніводнага сьцябла лёну на полі

Уборка лёну ў колгасе „Новая культура" Дрысенскага р-ну, дзякуючы правільнай організацыі працы, праходзіць па-ударнаму. Організаваны ўдарныя брыгады з дарослых колгасьнікаў, а таксама стацыянальныя ўдарна-комсамольскія брыгады, якія норму выпрацоўкі перавыконваюць на 60—70 проц. Усяго ў колгасе засеяна 51 га лёну і на 31 жніўня ўбрана ўжо 85 проц. агульнае плошчы засеву.

К 17 МЮД-у комсамольская ячэйка арганізавала [illegible] ўдарнай.

Комсамолец.

Мільён тон сілосу—ня менш

Ніводнага кілё бацьвіньня на сьметнік

Адкіды гародніны—у сілосныя ямы

Бабруйская комсамолія зрывае сілосаваньне

Накіраваць сілы і энтузіязм на гэты фронт

Сілосаваньне па Бабруйскім р-не знаходзіцца ў надзвычайна катастрофічным стане. На 1-е верасьня плян выкананы ўсяго толькі на 1,5 проц. Замест патрэбных 21120 тон засілосавана 600 тон корму.

Ня лепш абстаіць справа і з будаўніцтвам сілосных установак. З 61 ямы пабудавана толькі 20 з 50 траншэй пабудавана 13, з трох вежаў заканчваецца пабудова толькі адвае.

Плян будаўніцтва ям, вежаў і траншэй выканан на 34 проц. Большасьць колгасаў спазьнілася закласьці на сілос раньнюю зеляніну.

У Варатыніцкім сельсавеце, дзе налічваецца 11 колгасаў, толькі ў чатырох пабудаваны сілосныя ямы, але да гэтага часу не запоўнены яшчэ сілоснай масай. У Кавалеўскім сельсавеце толькі адзін колгас з 3-х („Най-Лебэн") пабудаваў ямы і засілосаваў кармамі.

Такое становішча з сілосаваньнем кармоў сыгналізуе аб пагрозе ўгал не забясьпечаньня жывёлагадоўлі кармамі, пашырэньня гурту малочна-жывёлагадоўчых і сьвінагадоўчых фэрм.

Райза і райколгассаюз ніякіх мер ня прымаюць, каб забясьпечыць поўнае выкананьне будаўніцтва сілосных установак і сілосаваньне кармоў,—яны спадзяюцца на самацёк.

Комсамол Бабруйшчыны таксама праяўляе бязьдзейнасьць. Пастанова ЦК ЛКСМБ аб правядзеньні паходу за сілос, організацыю комсамольскіх суботнікаў па будаўніцтву і сілосаваньню, не абгаворана на бюро раённага камітэту і агульных комсамольскіх сходах.

Такім чынам, Бабруйская організацыя комсамолу зьяўляецца не барацьбітом за сілос, а вінаватцам ганебнага зрыву

Неабходна рашуча ўдарыць па тых, хто імкнецца справу сілосаваньня пусьціць на самацёк, хто не жадае выконваць рашэньні партыі і ўраду аб забясьпечаньні соцыялістычнай жывёлагадоўлі кармовай базай.

Ф. Хазанаў

Ямы не павінны пуставаць

Сілосаваньне кармоў у Гразьвіцкім сельсавеце Клімавіцкага раёну зрываецца, бо на гэты ўчастак ня зьвернута даволі ўвагі.

Комсамольцы колгасу імя Молатава сумесна з беспартыйнай моладзьдзю выкапалі ўжо дзьве ямы. Ямы засталіся не засілосаванымі, дзякуючы ня дбайным адносінам старшыні колгасу, які не знайшоў чым запоўніць іх.

А. В.

Райколгассаюз спыніў сілосаваньне

НАРОЎЛЯ 9 (Па тэлеграфу). У Нараўлянскім раёне засілосав на 105 тон кармоў. Комсамольская організацыя Нараўляншчыны бязьдзейнічае. Райколгассаюз адказвае: „плян нявыкананы і ўжо позна яго выконваць".

Субач

Спраўдзіць назву шэфа сілосаваньня

У Слуцкім р-не вакол сілосаваньня ў апошні час складзена поўная грамадзкая думка і нададзена гэтаму пытаньню належнае гаспадарча-політычнае значэньне.

Усе сілы раёну кінуты на фонт сілосаваньня. Мобілізавана 200 студэнтаў Белпэдтэхнікуму, якія кінуты ў сельсаветы раёну. Аднак гэта яшчэ не забясьпечыла карэннага пералому ў галіне сілосаваньня і разгортваньня будаўніцтва сілосных установак. Плян сілосаваньня па раёне выкананы толькі на 6 проц.

У некаторых сельсаветах раёну сілосаваньне яшчэ закінуты вучасткам, там пануе опортуністычная недаацэнка стварэньня належнай кармовай базы праз сілосаваньне пустазельля.

Колгас „Чырвоная Ніва" павінен засілосаваць 240 тон кармоў, але сілосаваньня не пачынаў. Колгас „Вольная Беларусь" і „Чырвоная зорка"—таксама, а павінны былі закласьці каля 500 тон сілоснай масы. Колгас „Чырвоная зорка" нават не пачынаў яшчэ капаць ямы. Старшыня колгасу „Чырвоная ніва" разважае:—„Нашы каровы сілосу не ядуць, а калі так настойваюць, дык трэба некалькі тон для прыкметы засіласаваць".

Такой опортуністычнай, хуна-куляцкай думцы комсамольская ячэйка і праўленьне колгасу не даюць належнага адпору.

РК комсамолу павінен усю ўвагу і сілы комсамольскіх мас накіраваць на сілосны фонт, на выкананьне пляну сілосаваньня з тым, каб спраўдзіць назву шэфа сілосу і соцыялістычнай жывёлагадоўлі.

Брыгада „Ч. З." Прыбытак Вяроўка

Зьнішчыць пагрозу

Плян сілосаваньня па Азарынскім сельсавеце выконваецца зусім дрэнна. Сілосаваньне распачаў толькі адзін колгас „Дзень ураджаю", які ўжо заклаў 23 тоны сілоснай масы, астатнія-ж колгасы яшчэ толькі прыступаюць да будаўніцтва сілосных установак.

Азарынская комсамольская ячэйка не зьвярнула ўвагі на будаўніцтва ям у колгасе „1-га Мая".

Плян сілосаваньня ў колгасе „Кастрычнікавая перамога" скарочаны, а комсамольская ячэйка аб гэтым ня ведае, яна ня цікавіцца выкананьнем пляну. Ячэйка ня ведаючы аб стане сілосаваньня ў сваім колгасе, пачала організоўваць суботнік па копцы ям у суседнім колгасе „Чырвоны сьцяг", але суботнік быў правален.

Скарочаны плян сілосаваньня і ў колгасе імя 16 партзьезду, дзе патрэбна было засіласаваць 70 тон, але зараз прыступлена толькі да будаўніцтва сілосных установак.

Калі сэкратару комсамольскай ячэйкі Таўкачу заўважылі аб скарачэньні пляну, дык ён адказаў:—„З нас хопіць і гэтага". Таксама зусім бязьдзейнічае і Бечанская ячэйка КСМ. Некаторыя колгасы зусім ігнoруюць сілосаваньне і ўсімі мерамі зрываюць выкананьне пляну.

Міхась

Адказны рэдактар МІХ. ПЛАТАЎ.

Паведамленьні

Прыём заяў на аднагадовыя курсы комсамольскага актыву пры Комвузе Беларусі працягваецца да 1-Х г. г. Іспыты на курсы адбудуцца 10-Х г. г. Усе райкомы да гэтага часу павінны забясьпечыць сваячасовую яўку вылучаных таварышоў на курсы.

Курсавы сэктар Комвузу.

Дом навукі і тэхнікі

(Былы Дом Комсамолу) Апавяшчае што бібліятэка пачынае працаваць з 10-га верасьня 1931 г. і адчынена штодзённа ад 6-ці да 10-ці гадзін увечары.

Праводзіцца перэгістрацыя чытачоў. Просьба да ўсіх чытачоў зьвярнуць узятыя раней кнігі.

11 верасьня г. г. у памяшканьні Дому Навукі і Тэхнікі адбудзецца агульна-гарадзкая нарада актыву КСМ, на якой павінны быць сэкратары комсамольскіх колектываў, цэхавых яч., члены бюро.

Нарада склікаецца па пытаньню:

1. Аб падрыхтоўцы КСМ організацыі да манэўраў.

Пасьля нарады выступленьне комсамольскага поэты Уткіна.

Білеты ў гаркоме КСМ.

Заг. орг. аддз. Менгаркому ЛКСМБ Канопік.

Друкарня імя тав. Сталіна.

Галоўлітбел № 599